## Сёстры Хатыні

Магчыма, цяжка боль адчуць,
Боль не сваёй душы.
Магчыма, цяжка крык пачуць,
Крык на сляпой мяжы.

Шымкі не могуць гаварыць,
Жыцця згубіўшы след,
І помнікам ў свет глядзіць,
У чысты, мірны свет.

Калісь і тут было жыццё,
Дзіцячы чуўся смех,
Людское шчасце ў снах жыло,
Кахаць было не грэх…

Тут зерне сыпалі ў зямлю,
З ільна плялі вянкі
І тут казалі: “Я люблю…”
Дзяўчатам юнакі.

Не носіць пісьмаў паштальён –
Лісты пайшлі ў свет,
Застаўся боль і горкі звон
Ды чорнай смерці след.

Халодны помнік…
Тых людзей
У жыццё ўжо не вярнуць,
Светлавалосых іх дзяцей –
Званочкаў не пачуць…

І слёзы ў вачах дрыжаць,
Нібы нямы дакор,
А ў душы званы звіняць
Аб кожным, хто памёр…

І рэха звона даляціць
Па ўсёй нашай зямлі.
Пра вёскі, боль, баліць-звініць,
Што дымам адышлі.